Упраўленне па адукацыі
адміністрацыі Ленінскага раёна г.Мінска
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
“Маяк” г.Мінска”

Аддзел мастацкага выхавання

# Метадычныя рэкамендацыі

# ЛІЧБАВЫ АДУКАЦЫЙНЫ РЭСУРС ВІРТУАЛЬНАЯ ЭКСКУРСІЯ (ВІДЭААГЛЯД) “ЯК ГУЧЫЦЬ ЛЮБАНШЧЫНА”

Аўтар-складальнік:
Мардань Дар’я Анатольеўна,
педагог дадатковай адукацыі
першай кваліфікацыйнай катэгорыі,
магістр мастацтвазнаўства,
аспірант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў
маб. тэл. +375(29) 575-79-03
e-mail: dashamordan@mail.ru

Метадычнае суправаджэнне:
Гарэлік Наталля Яўгенаўна,
загадчык аддзела мастацкага выхавання
маб. тэл. +375(29) 320-24-17
e-mail: lencvr@minskedu.gov.by

МИНСК

2022

## АНАТАЦЫЯ

Відэаагляд "Як гучыць Любаншчына" распрацаваны да раздзела "Манера выканання розных этнаграфічных рэгіёнаў" праграмы фальклорнага ансамбля "Млынок" *(Дадатак № 1),* мэта якога заключаецца ў азнаямленні навучэнцаў з абрадам "Провады русалкі" і манерай выканання аўтэнтычных песень Любанскага рэгіёну. Выкарыстанне такога фармату як відэаагляд дае магчымасць прадставіць інфармацыю праз відэа і стварыць у гледача эфект прысутнасці.

**МЭТА ВІДЭААГЛЯДУ:** азнаямленне навучэнцаў з аўтэнтычнай манерай выканання песень падчас абраду "Провады русалкі".

**ЗАДАЧЫ ВІДЭААГЛЯДУ**

**АДУКАЦЫЙНЫЯ:**

– знаёміць навучэнцаў з фальклорнай спадчынай Любаншчыны;

– далучаць дзяцей і падлеткаў да аўтэнтычных форм народных спеваў;

**РАЗВІЦЦЁВЫЯ:**

– пашыраць эмацыянальна-вобразны свет дзяцей;

– фарміраваць каштоўнасныя арыенціры навучэнцаў, усведамленне значнасці традыцыйнай культуры свайго народу;

**ВЫХАВАЎЧАЯ:**

– выхоўваць у дзяцей і падлеткаў пачуццё патрыятызму і любові да Бацькаўшчыны на аснове фальклору.

## АДУКАЦЫЙНЫЯ ВЫНІКІ, ЯКІХ ДАЗВАЛЯЕ ДАСЯГНУЦЬ ПРАГЛЯД ВІДЭААГЛЯДУ "ЯК ГУЧЫЦЬ ЛЮБАНШЧЫНА"

***Для навучэнцаў:***

– замацаванне вывучанага на занятках матэрыялу;

– магчымасць у дыстанцыйным фармаце самастойна асвойваць новы навучальны матэрыял;

– пашырэнне кругагляду;

***Для педагога дадатковай адукацыі:***

– эфектыўнае прымяненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і лічбавых адукацыйных рэсурсаў у адукацыйным працэсе;

– стварэнне аўтарскіх лічбавых адукацыйных рэсурсаў згодна з раздзеламі і тэмамі праграмы;

– развіццё новых кампетэнцый і ўдасканаленне прафесійнага ўзроўню (вывучэнне відэатэхнікі, асноў здымкі, засваенне новых рэдактараў, праграм мантажу і спецыфікі агучвання лічбавых адукацыйных рэсурсаў);

– форма ўзаемадзеяння педагога з навучэнцамі і іх бацькамі.

## СТРУКТУРА І КАРОТКІ ЗМЕСТ ВІДЭААГЛЯДУ "ЯК ГУЧЫЦЬ ЛЮБАНШЧЫНА"

Відэаагляд "Як гучыць Любаншчына" складаецца з наступных структурных частак:

**1. Уступная частка:**

– прадстаўленне (кароткая інфармацыя пра аўтара, месца працы, назва гуртка);

– паведамленне тэмы, мэты і задач відэаагляда.

**2. Асноўная частка:**

– знаёмства з носьбітамі аўтэнтычнай спеўнай культуры Любаншчыны: Марыяй Гаўрылаўнай Насановіч, Марыяй Гаўрылаўнай Бакун, Раінай Канстанцінаўнай Слівец і Марыяй Платонаўнай Слівец.

– знаёмства з міфалагічнай істотай русалка і важнасцю правядзення абраду;

– знаёмства з асноўнымі этапамі абраду “Провады русалкі”:

1 этап: “Абыход вуліцы вескі”;

2 этап: “Агульны карагод”;

3 этап: “Карагод каля вогнішча”;

4 этап: “Частаванне абрадавай яешняй”;

**3. Заключная частка:**

– эмацыянальнае завяршэнне, заклік да вывучэння культурнай спадчыны Беларусі;

– магчымыя сферы выкарыстання вывучанага матэрыялу;

– матэрыял, які выкарыстоўваецца ў відэаагляддзе.

## МАГЧЫМЫЯ СФЕРЫ ВЫКАРЫСТАННЯ ВІДЭААГЛЯДУ “ЯК ГУЧЫЦЬ ЛЮБАНШЧЫНА”

Відэаагляд “Як гучыць Любаншчына” можа выкарыстоўвацца:

– як структурная частка навучальных заняткаў па фальклоры;

– у фармаце дыстанцыйнага навучання і самаразвіцця навучэнцаў.

Дэманстрацыя відэаагляду на занятках прадмета “Музыка” ва ўстановах сярэдней адукацыі, дадатковай адукацыі, на занятках фальклорных калектываў дазваляе перадаць інфармацыйную насычанасць вучэбнага матэрыялу за кароткі прамежак часу, які складана перадаць пры вусным выкладанні і з выкарыстаннем іншых сродкаў навучання.

## ЗМЕСТ

Каляндарна-абрадавая творчасць ахоплівала сабой асноўныя сферы быцця і жыццядзейнасці чалавека. Абрад “Провады русалкі” праводзіцца з мэтай аховы ураджаю і існуе ў Любанскім раёне ў выглядзе рэгіянальнага свята “Русальная нядзелька” *(Дадатак № 2)*. Відэаагляд “Як гучыць Любаншчына” адрасаваны педагогам, кіраўнікам фальклорных калектываў з мэтай азнаямлення і вывучэння абрадавай культуры беларусаў.

Відэаагляд “Як гучыць Любаншчына” створаны для наступных груп карыстальнікаў:

– навучэнцаў, якія вывучаюць фальклор;

– бацькоў навучэнцаў для азнаямлення з адукацыйным матэрыялам, які асвойваюць навучэнцы;

– педагагічных работнікаў для распаўсюджвання эфектыўнага педагагічнага вопыту.

Выкарыстанне відэаагляду “Як гучыць Любаншчына” спрыяе дасягненню мэты і вырашэнню задач адукацыйнага працэсу згодна з праграмай гуртка “Млынок” (мастацкі профіль, базавы ўзровень вывучэння адукацыйнай галіны “Музычнае мастацтва”, пратакол метадычнага савета №2 ад 14.09.2022г., загад №230 ад 15.09.2022).

**Мэта:** развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў сродкамі аўтэнтычных спеваў.

**Задачы**

**навучальныя:**

– развіваць творчыя здольнасці, пашыраць эмацыянальна-вобразны свет дзяцей сродкамі каляндарна-абрадавай і пазаабрадавай музыкі;

– далучаць дзяцей і падлеткаў да аўтэнтычных форм народнага музычна-харэаграфічнага мастацтва;

**развіццёвыя:**

– садзейнічаць гарманізацыі асобы навучэнца шляхам далучэння да беларускага этнамузычнага мастацтва;

– выхоўваць на аснове фальклору пачуццё патрыятызму і любові да Бацькаўшчыны.

– развіваць мастацкі густ сродкамі беларускага фальклору;

**выхаваўчыя:**

– фарміраваць каштоўнасныя арыенціры ў напрамку ўсведамлення значнасці традыцыйнай культуры свайго народа ў сістэме культуры чалавецтва.

## АПІСАННЕ ТЭХНАЛОГІІ ВЫКАРЫСТАННЯ ВІДЭААГЛЯДУ “ЯК ГУЧЫЦЬ ЛЮБАНШЧЫНА”

Тэхналогія выкарыстання ў адукацыйным працэсе відэаагляду “Як гучыць Любаншчына” ўключае ў сябе:

– прагляд відэароліка (абмеркаванне і аналіз матэрыялу);

– непасрэднае азнаямленне з манерай выканання песень (спецыфіка выканання песень Любанскага краю);

– азнаямленне з асноўнымі этапамі абраду “Провады русалкі”;

– прымяненне атрыманых ведаў на практыцы (узнаўленне часткі абраду “Провады русалкі” і выкананне песень у спецыфічнай манеры).

## МЭТАЗГОДНАСЦЬ ДАСЯГНЕННЯ АДУКАЦЫЙНЫХ ВЫНІКАЎ ВІДЭААГЛЯДУ “ЯК ГУЧЫЦЬ ЛЮБАНШЧЫНА”

Мэтазгоднасць распрацоўкі прапанаваных інфармацыйных крыніц і інструментаў заключаецца ў фарміраванні ведаў пра традыцыйную культуру Беларусі, азнаямленні з музычным фальклорам, развіцці пачуцця патрыятызму.

## ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ДАСЯГНЕННЯ АДУКАЦЫЙНЫХ ВЫНІКАЎ ВІДЭААГЛЯДУ “ЯК ГУЧЫЦЬ ЛЮБАНШЧЫНА”

Эфектыўнасць дасягнення адукацыйных вынікаў заключаецца ў выкарыстанні новых метадаў засваення вакальнай этнафоніі. Выкарыстанне відэаагляду спрыяе развіццю цікавасці навучэнцаў да фальклорных

экспедыцый. ***Метад уключанага назіраня*** мае на ўвазе непасрэдны кантакт з носьбітамі культуры для вывучэння нацыянальных традыцый. Важнасць метаду пры засваенні фальклорнага матэрыялу абумоўлена характарам існавання фальклору. Фальклорная традыцыя мае на ўвазе непасрэдную вусную перадачу. Традыцыйныя спевы і танцы засвойваюцца «з голасу на голас», «з нагі на нагу». Малодшае пакаленне спевакоў і танцораў, назіраючы за старэйшымі, вучыцца ў іх і паступова далучаецца да спеваў і танцаў («рабі як я»). Такі спосаб перадачы забяспечвае арганічнасць, захаванне аўтэнтычных (сапраўдных) стылю і манеры выхавання. Новыя адукацыйныя вынікі, якія могуць быць забяспечаны выкарыстаннем фальклорнымі гуртамі відэаагляду "Як гучыць Любаншчына", – гэта засваенне рэгіянальнай аўтэнтычнай русальнай песенна-абрадавай традыцыі, функцыянальнай ролі ў абраднасці русальнага тыдня. На Любаншчыне на сённяшні дзень вылучаны 2 тыпавыя напевы і 2 лакальныя. Два тыпавыя напевы русальных песень існавалі ў вёсках, дзе абрад "Провады русалкі" праводзіўся з даўніх часоў: Кузмічы, Баянічы, Палічын, Вялікія і Малыя Гарадзячыцы, Камуна, Загалле, Нежын, Сосны і інш.

Да першага тыпу адносяцца песні "Пamaжы нам, Божа", "Вой, яблынка наша", "Ой у боры сосна", "А на вясну красну" (Рэфрэн "Божа мілы"). Гэты тып архаічны і з даволі складанай музычнай рытмаформай.

Да другога тыпу адносяцца песні "На моры вутка купалася", "Ой была тройца, не была", "У вагародзе пад вербою". Для другога тыпавога напеву характэрна кварта ва ўступе, больш плаўны характар голасавядзення, але фрагментарна маторны, таксама гетэрафонны стыль інтанавання, О-абразная артыкуляцыйная устаноўка.

Авалодаць манерай аўтэнтычных спеваў русальных песень у адукацыйным працэсе магчыма з дапамогай этнафанічнага аналізу песень, у якім адлюстроўваецца спецыфіка дыялекту і маўлення Любаншчыны. Распрацавала методыку этнафанічгнай транскрыпцыі Т.А. Пладунова. *(Дадатак 4).*

Таксама для засваення песень педагогам неабходна выкарыстоўваць наступныя спецыяльныя метады:

1. метад тэхнічна апасродкаванага назірання (праслухоўванне аўтэнтычных песенных узораў з дапамогай тэхнічных сродкаў);
2. аналітычны (этнафанічны аналіз);
3. імітацыйна-імправізацыйны (дакладная інтэрпрэтацыя гучання этнафанічнага ўзору);
4. фанетычна-канцэнтрычны (паслядоўная інтэнсіўнасць тэсітуры выканання і тэмбравай палітры).

Адсутнасць патрэбнай колькасці тэкстаў на наступныя напевы не дае нам падставы меркаваць, што яна тыпавыя, пакуль што іх можна аднесці толькі да ***лакальных.*** **Першы лакальны напеў** на тэкст "Русалачка-купалачка", які хутчэй за ўсё больш позняга паходжання. Для яго характэрны плаўны характар голасавядзення, стыль інтанавання – манодыя, А-абразная артыкульцыйная ўстаноўка, пярэднеязычная пазіцыя. **Другі лакальны напеў** прадстаўлены песняй "Прывяду русалачку я да бору" ў сольным выкананні Марыі

Гаўрылаўны Насановіч. Гэты напеў з прычыны сольнага роду выканання і тэксту мае рухомую структуру. Яго характарызуюць напеў старажытнага паходжання, сярэднеязычная пазіцыя, О-абразная артыкуляцыйная ўстаноўка, характар голасавядзення – плаўны (нотная расшыфроўка гл. *Дадатак 4*).

Вылучаныя два тыпавыя напевы і два лакальныя, распаўсюджаныя на тэрыторыі Любаншчыны, дзе абрад мае старажытнае паходжанне: вёскі Жывунь, Татарка, Палічын, Малыя і Вялікія Гарадзячыцы, Нежын, Кузьмічы, Калінаўка, Дворышча, Дварэц, Загалле, Баянічы, Сярэдзібар (Канстанцінаўка), Пагной (Гуляева), Куценка, Барыкоў, Азярное, Ямнае.

Кожны чалавек павінен ведаць традыцыі і мову свайго народа, таму трэба ўсвядоміць: чым больш будзе нацыянальнага ў выхаванні, тым мацнейшым стане духоўнае багацце нацыі. Далучэнне да народных традыцый, абрадаў і святаў спрыяе рознабаковаму развіццю і выхаванню дзяцей розных узростаў, фармаванню свабоднай, духоўнай і творчай асобы.

Праца з музычным і вусным фальклорным матэрыялам з’яўляецца адным з лепшых сродкаў развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў. Пачынаць знаёміць падрастаючае пакаленне з фальклорам трэба з ранняга ўзросту. Фальклор дазваляе не толькі ажыццяўляць грамадзянскае выхаванне, але і эфектыўна фарміраваць творчыя ўменні і навыкі. Аўтэнтычныя традыцыі выканання песень атрымалі статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь, таму вельмі важна працягваць традыцыі і перадаваць свае веды моладзі.

## ПЕРАЛІК ДАДАТКАЎ

1. Спасылка на праграму гуртка “Млынок” (мастацкі профіль, базавы ўзровень вывучэння адукацыйнай галіны “Музычнае мастацтва”, пратакол пасяджэння метадычнага савета №2 ад 14.09.2022, загад дырэктара №230 ад 15.09.2022).

2. Сцэнарый рэгіянальнага народнага свята “Русальная нядзелька”.

3. Абрадавая карта провадаў русалкі на Любаншчыне (вёска Камуна).

4. Этнафанічныя транскрыпцыі русальных песень: “На моры вутка купалася”, “Русалачка, купалачка”, “Прывяду русалачку я да бору”.

***Дадатак 1***

Спасылка на праграму гуртка “Млынок” (мастацкі профіль, базавы ўзровень вывучэння адукацыйнай галіны “Музычнае мастацтва”, пратакол пасяджэння метадычнага савета №2 ад 14.09.2022, загад дырэктара №230 ад 15.09.2022).

*https://mayak.minskedu.gov.by/files/01581/obj/145/71533/doc/Млынок.%20Мардань%20Д.А..pdf*

*Дадатак 2*

## СЦЭНАРЫЙ РЭГІЯНАЛЬНАГА НАРОДНАГА СВЯТА "РУСАЛЬНАЯ НЯДЗЕЛЬКА"

У русальную нядзелю, якая адзначаецца напрыканцы Русальнага тыдня, што настае адразу за Сёмухай, у адну вёску збіраюцца гурты з шасці Сельскіх дамоў куьтуры вёсак Камуна, Палічын, Загалле, Кузмічы, Нежын, Малыя Гарадзячыцы. Кожная вёска прадстаўляе сваю дзяўчыну-русалку, каб у спаборніцтве выбраць лепшую. Напачатку свята па старажытным звычаі выконваецца карагод-шэсцце "Папярок вуліцы", затым на спецыяльным месцы, якое яшчэ называюць "Красная горка", раскладаюць агонь, у якім дзяўчаты спальваюць вянкі, а старэйшыя жыхары – траецкі май. Агонь кладуць у выглядзе калодзежа і вакол яго водзяць карагоды:

"Карагод папярок вуліцы", "У ключ, ключам" – па вуліцах з русальнымі песнямі, узяўшыся пад рукі, некалькім шарэнгамі да аднаго месца сыходзяцца гурты. Кожны гурт, які прадстаўляе сваю вёску, вядзе сваю русалку. Русалку пад рукі вядуць дзяўчаты, у русалкі ў руках букет кветак, а гурты нясуць траецкую зеляніну.

Спасылка:
https://drive.google.com/drive/folders/11QuW4FMVvACQxh544jreQUWnYycLA6Lf?usp=share_link

– "Русалачка наша, русалачка наша …", – гурты, падышоўшы да месцца "спальвання русалкі", заводзяць кожны вакол сваёй кругавы карагод, кожны гурт спявае сваю песню.

Спасылка:
https://drive.google.com/drive/folders/11QuW4FMVvACQxh544jreQUWnYycLA6Lf?usp=share_link

– "На табе, русалка, майго вяночка", – абрад спальвання дзявочых вяночкаў. Да "калодзежа-кастрышча" падыходзяць дзяўчаты з песняй "На моры вутка купаласа" і становяцца ў карагод вакол вогнішча. Кожная па чарзе кідае з песняй свой вянок у агонь, спяваецца карагод "Ой, яблынка наша".

Спасылка:
https://drive.google.com/drive/folders/11QuW4FMVvACQxh544jreQUWnYycLA6Lf?usp=share_link

– "Памажы нам, Божа", – гурты аднaчасова на сваіх месццах запяваюць "Памажы нам, Божа". Русалкі выходзяць наперад і ідуць да вогнішча, несучы ў яго свае букеты. Гурты паўдугамі сыходзяцца да вогнішча і таксама кідаюць у агонь траецкую зеляніну, выказваючы пажаданні: "Згары з маем і хвароба".

– "Ой, яблынка наша" – русалкі становяцца спіною да вогнішча а ўсе гурты бяруцца ў агульны карагод які будзе рухацца "на вотвіль" супраць сонца, русалкі неберучыся за рукі пойдуць за сонцам, гучыць песня "Ой, яблынка наша".

Спасылка:
https://drive.google.com/drive/folders/11QuW4FMVvACQxh544jreQUWnYycLA6Lf?usp=share_link

– "А на вясну красну", – кожны гурт на фінал гэтай песні забірае сваю русалку ў свой карагод. Усе разрываюць рукі і стаяць нерухома, толькі русалкі скачуць, высока падымаючы ногі. Кожны гутр зноў запявае сваю траецкую песню.

На імправізаваную сцэнічную пляцоўку, упрыгожаную зелянінай, стужкамі і вянкамі, выходзіць Мая – Багіня веснавой зеляніны, вядучая свята. Мая прыбрана ў бялюткі даматканы строй, на галаве – вянок з зеляніны: з поля, з лесу, з лугу, з

рэчкі….
МАЯ:
На зелянец – вясны канец, вясну праважаем – лета сустрачаем.
Добры дзень, лета, добры дзень, краснае!
Здаравенькі будзь, народзе, пры добрай нагодзе.
У полі буйнае жыта красуе,
Русалкам розыгры даруе.
Спалілі русалку – ахвяру!
Вядзём дзевачак-русалачак
З нашых краёў, мясцовых палёў
Да суседніх берагоў.
Паўстрачацца, паспрачацца,
Катора знадабейша, прыгажэйша.

*(Зберагальніца траецкіх русальных традыцый Раіна Слівец з Малых Гарадзячыц і дзяўчаты-русалкі Малагарадчаначка і Нежынаўчаначка).*

На сцэнічную пляцоўку з траецкай песняй выходзіць жанчына і дзве дзяўчыны-русалкі. Пакуль гучыць песня, яны красуюцца перад гледачамі.

*(Зберагацельніца траецкіх русальных традыцый Ганна Палазнік з Кузмічоў і дзяўчаты-русалкі Загалляўчаначка і Кузмічаначка).*

На сцэнічную пляцоўку з траецкай песняй выходзіць жанчына і дзве дзяўчыны-русалкі. Пакуль гучыць песня, яны красуюцца перад гледачамі.

*(Зберагацельніца траецкіх русальных традыцый Марыя Трубчык з Палічына і дзяўчаты-русалкі Камунараўчаначка і Палічаначка).*

На сцэнічную пляцоўку з траецкай песняй выходзіць жанчына і дзве дзяўчыны-русалкі. Пакуль гучыць песня, яны красуюцца перад гледачамі.

МАЯ:
Прывялі русалку із бору да бору,
Із бору да бору, ў зялёную дуброву.
У зялёную дуброву, у ядраное жыто.
У ядраное жыто, там русалачцы жыці.
Гэй, хлопцы траецкія, хлопцы-малойцы,
Не стойце, не зявайце, вянец-зелянец хапайце
Ды моцна трымайце!
Хто вянца з зелянца спаймаець –
Той на цэлы год прыдбаець.
Хто вянца з зеленца адцураецца –
Той на цэлы год адракаецца.
Хто вянца з зеленца падымае –
Той на цэлы год долю прызывае.
Хто вянца –зелянца патопча –
Той цэлы год праквокча.

/Гучыць траецкая песня “На моры вутка купаласа”. Русалкі, прайшоўшы па коле, па чарзе кідаюць вянкі ў залу./

МАЯ:
Траецкія хлапцы-малайцы!

Хто з вас вяночка схапіў? Не адцурайся, да нас падыходзь! Вас чакаюць русалкі-дзявіцы … А вы русалачкі свайго хлапца па вяночку пазнавайце ды хаця ж моцна трамайце!

/Тыя хлопцы, што злавілі вянкі, выходзяць да той русалкі, чый вянок злавілі. Вянкі зноў адзяюцца на галовы русалкам. Невялікія вянкі адзяюцца на галовы і хлопцам./

МАЯ:

Дзевачкі-сястрыцы, падайце вадзіцы з халоднай крыніцы,
Падарыце хвартушок і спадніцы на наш стан ніцы.
Прыбіраці будзем русалачку-красу, ды кожны сваю.
Вось тут, хлопчыкі, хвартушкі. Вы іх бярыце, ды сваю русалачку прыбярыце!

/Хлопцы прыбіраюць русалачак. Гучыць песня "Ў балоце на купіне" у выкананні Палічынскіх дзяўчат./

МАЯ:

Дзевачкі-сястрыцы, падайце вадзіцы з халоднай крыніцы,
Падарыце ўплёткі ў нашыя косачкі.
Прыбіраці будзем русалачку-красу, ды кожны сваю. Косу заплясці.
Вось вам, хлопчыкі, уплёткі, запляціце русалак-дзявічак, і не спяшайце!

/Хлопцы заплятаюць русалкам косы, гучыць трецкая песня "Ў балоце на купіне" у выкананні Палічынскіх дзяўчат./

МАЯ:

Дякуй вам, хлопцы траецкія, за дапамогу. Прыбралі русалак як цвет! Вось вам падаруначкі на добры ўспамін-прывет.

/Хлопцам русалкі ўручаюць сувеніры і праводзяць у залу./

МАЯ:

Дзевачкі-сястрыцы, падайце вадзіцы з халоднай крыніцы,
Падарыце таночак на наш зялёны лужочак.
Падарыце спяваннейка на наша разыграннейка.
Русалкі розыгру чакаюць, народ лепшую выбірае.
А кожная вёска сваю абараняе.

/Па чарзе гучаць нумар мастацкай самадзейнасці ад кожнай вёскі, па чарзе красуюцца русалкі./

МАЯ:

Русалка-дзявіца з Кузміцкага краю,
Русалка-дзявіца з Палічынскага гаю,
Русалка-дзявіца з Камунараўскіх узлескаў,
Русалка-дзявіца з Нежынскіх пералескаў,
Русалка-дзявіца з Гарадзячыцкіх паплавоў,
Русалка-дзявіца з Загальскіх лугоў.

МАЯ:

Што ж, русалкі-дзявіцы, будзем зараз вас вадою прычашчаць ды найпершую вызначаць. Бярыце свае збанкі з вадою, і кожная будзе па чарзе замову выказваць і вадзіцы адліваць. Каторая перальe, тая й верх возьме.

/Вядучая трымае ў руках збанок, накрыты палатном. Русалкі па чарзе падыходзяць і з замоваю адліваюць вады./

Тэкст замовы:

"Просім вас, русалкі,
Наш двор праміньце,
У вёску не хадзіце,
Жыта не ламіце,
Скацінку не бярыце,

Нас не пужайце.
Шчасце нам і долю дайце!

МАЯ:

Вада са збана верхам пацякла,
русалачка верх узяла.
/Адзяе русалцы вялікі вянок, свой русалачка трымае ў руках./

МАЯ:

Табе, русалка-царыца, пачэсны вянец на ўвесь год знасіць. А год у русалачкі ад Сёмухі да Пятра – а пасля на дне вада халадна.

А зараз ідзі, увесь люд вадзіцай акрапі, каб добра летувалі.

/Русалкі робяць круг карагода вакол царыцы і ідуць акрапляць людзей./

МАЯ:

Правядзём русалку да бору, за гору, да рачное вады.
Правядзём русалку ў жыта – каб была наша доля сыта.
Завядзём яе, вянок разарвём – а самі ўцякаць будзем,
Каб яна нас не дагнала, каб нас горам не дастала.

/Усе гурты з песнямі "Русалачка Купалачка" і "Правяду русалку да бору" рухаюцца да ракі. Наперадзе ідзе абраная русалка, за ёю карагодам яе сяброўкі і дзяўчаты, далей усе калектывы. Русалкі развешваюць на галінкі дрэў стужачкі з паперы, іншым разам водзяць вакол невялікіх дрэўцаў карагоды. Дайшоўшы да вады, кожная дзяўчына-русалка кідае са словамі загавору свой вянок на ваду ці за рэку ў жыта. (Дзяўчаты апускаюцца да вады).

Загавор:

1 – правяду русалку да бору – а сама вярнуся дадому;
2 – правяду русалку ў цёмны бор – а сама вярнуся ў таткаў двор;
3 – правяду русалку да мяжы – а сама вярнуся да дзяжы;
4 – правяду русалку да ямкі – а сама вярнуся да мамкі;
5 – вам, русалкі, вяночкі, а нам маладым – сярпочкі;
6 – вам, русалкі ў зямлі сваці, а нам маладым жыто жаць.

/Пасля выказаных слоў кожная кідае свой вянок за раку, на ваду, у жыта./

МАЯ:

Правядзём русалачку, правядзём, яе вяночак разарвём.
А самі уцячом, каб яна нас не дагнала ды нас горам не дастала.

/Русалкі разрываюць вянок на галоўнай русалцы, піхаюць яе ў ваду (жыта) і уцякаюць. Русалка спрабуе іх дагнаць. Гурты, зноў выстраіўшы **карагод папярок вуліцы "у ключ"**, цяпер, па чарзе пеючы траецкія песні, ідуць да вогнішча.

На паляне кожны гурт расцілае посцілку і садзіцца падсілкавацца. У гэты час адна з жанчын замаўляе абрадавую ежу: б'е з загаворамі на патэльню яйкі, да яе далучаюцца жанчыны з іншых гуртоў, кожны пячэ яечню па-свойму. Прапануюць спячы сваю яечню і гледачам. Частуюць усіх абрадавай гарэлкай, наліваючы яе ў яечную шкарлупку і раздаюць яечню.

"Добры дзень, лета!" Свята працягваецца святочным канцэртам разам з частаваннем і перацякае ў народнае гулянне з танцамі, абдымкамі і прыпеўкамі./

**Сцэнарый склаў С.Г.Выскварка, спецыяліст па фальклоры і этнаграфіі Любанскага РЦК.**

*Дадатак 3*

# АБРАДАВАЯ КАРТА ПРОВАДАЎ РУСАЛКІ НА ЛЮБАНШЧЫНЕ (ВЁСКА КАМУНА)

| **АКЦЫЯНАЛЬ-НЫ КОД** *ХОД АБРАДАВЫХ ПАДЗЕЙ* | **ТЭМПАРАЛЬ-НЫ КОД** *ЧАС АДПРАЎЛЕННЯ АБРАДАВЫХ ПАДЗЕЙ* Апошні тыдзень перад Вялікім постам – рухомая дата | **ЛАКАТЫЎНЫ КОД** *МЕСЦА АДПРАЎЛЕННЯ АБРАДАВЫХ ПАДЗЕЙ* | **ПЕРСАНАЛЬ-НЫ КОД** *КОЛА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ, ПЕРСАНАЖЫ АБРАДАВЫХ ПАДЗЕЙ* | **АТРЫБУ-ТЫЎНЫ КОД** *АБРАДАВАЯ АТРЫБУТЫКА І ПРЫЛАДЫ Ў АБРАДАВЫХ ПАДЗЕЯХ* | **МУЗЫЧНА-ВЕРБАЛЬНЫ КОД** *ПЕСЕННАЕ І ВЕРБАЛЬНАЕ СУПРАВАДЖЭН НЕ АБРАДАВЫХ ПАДЗЕЙ* | **МУЗЫЧНА-ІНСТРУМЕНТ. КОД** *ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЕ СУПРАВАДЖЭННЕ АБРАДАВЫХ ПАДЗЕЙ* | **ПЛАСТЫЧНЫ КОД** *ПЛАСТЫЧНАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ І ХАРЭАГРАФІЧНАЕ СУПРАВАДЖЭННЕ АБРАДАВЫХ ПАДЗЕЙ* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Абыход вескі** | У дзень | У полі | Дзяўчаты і міфалагічны персанаж “Русалка” | Вянкі, дошкі, заслонкі | Спяваюць Спявалі “памажы нам Божа, “яблынька наша, “русалачка-купалачка”” | Без музычнага суправаджэння | Шэсце па весцы |
| **Карагод** | Першы дзень Русальнага тыдня | У полі | Дзяўчыны | Вянкі | Спявалі памажы нам Божа, “яблынька наша, “русалачка-купалачка”” | Без музычнага суправаджэння | Водзячы карагоды |
| **Агульны карагод** | Першы дзень Русальнага тыдня | Каля вогнішча | Дзяўчаты | | Спявалі “Яблынька наша” | Без музычнага суправаджэння | Водзячы карагоды |
| **Спаборніцтва русалак (на даўжыню касы).** | Першы дзень Русальнага тыдня | Каля вогнішча | Дзяўчаты і хлопцы | Выклікаюцца хлопцы, яна заплятаюць косы русалкам пачынаецца спаборніцтва на самую доўгую косу | | Без музычнага суправаджэння | |
| **Абарона русалак ад свайго гурта** | Першы дзень Русальнага тыдня | | | Удзельнікі гурта, ад якога прадстаўляецц а русалка спяваюць ей песню | | Песня выконваецца любая па жаданню | |
| **Спаборніцтва русалак (на галоўную русалку)** | Першы дзень Русальнага тыдня | | | Русалкі наліваюць воду у жбанок ,пакуль не напоўніцца да краю, на якой русалцы вада перальецца, тая і галоўная | | Замовы | |
| **Кіданне вянкоў на дрэва** | Першы дзень Русальнага тыдня | Каля рэчкі | Дзяўчаты | Русалкі кідаюць вянкі на дрэваі вымаўляюць замовы, потым за імі ганяюцца чэрці | Замовы | Без музычнага суправаджэння | |
| **Абрадавая яешня** | Першы дзень Русальнага тыдня | Каля вогнішча | Усе | На вогнішчы пячэцца абрадаая яешня, сумесны абед. | Русальныя і пазаабрадавыя песні | Музычнае суправаджэнне | Седзячы, потым маглі быць танцы |

*Дадатак 4*

## ЭТНАФАНІЧНАЯ ТРАНСКРЫПЦЫЯ РУСАЛЬНАЙ ПЕСНІ "НА МОРЫ ВУТКА КУПАЛАСЯ"




Русальная, запісана ў в. Малыя Гарадзячыцы ад Вольгі Канстанцінаўны Цішка (1898-1999) і Раіны Канстанцінаўны Слівец (1921 г.н.)

| **Фальклорны тэкст** | **Этнафанічная транскрыпцыя** |
|---|---|
| | Музычны склад – двухгалоссе<br>Стыль інтанавання – гетэрафонія<br>Дыяпазон – ад до да сі першай актавы<br>Рэгістры фанацыі – памежжа ніжняга і сярэдняга рэгістра<br>Рэзанатары – грудная клетка – рота-глотка<br>Рэзанатарныя вузлы – грудная клетка – падбародак – цвёрдае паднябенне<br>Тып інтанавання – вакальны характар голасавядзення – плаўны, фрагментарна штуршковы<br>Пеўчая пазіцыя – сярэднеязычная<br>Артыкуляцыйная ўстаноўка – А |
| На моры вутка купалася<br>Край беражочка сушылася. Край беражочка сушылася,<br>Танечка ў мамкі прасілася.<br>-Ой, дай мне, мамка сваю волю,<br>Пайду на вулку пагуляю.<br>Мамачка волі не давала<br>Да ўсе каморкі замыкала.<br>А ў той каморкі акенечко,<br>Я акенечко прадзірала.<br>Я акенечко прачыняла<br>Да на вулачку пазірала. | На моры вутка купалася<br>Край беражэчка сушылася.<br>Край беражэчка сушылася,<br>Танечка ў мамкі прасілася.<br>– Вой, дай мне, мамка, сваю волю,<br>Пайду на **(ю)**йулку пагуляю.<br>Мамачка волі не давала<br>Да ўсе каморкі замыкала.<br>А ў той каморкі акенечко,<br>Я акенечко прадзірала.<br>Я акенечко прачыняла<br>Да на **(ю)**йулачку пазірала. |

## ЭТНАФАНІЧНАЯ ТРАНСКРЫПЦЫЯ РУСАЛЬНАЙ ПЕСНІ “РУСАЛАЧКА, КУПАЛАЧКА”




| **Фальклорны тэкст** | **Этнафанічная транскрыпцыя** |
|---|---|
| | Музычны склад –аднагалоссе<br>Стыль інтанавання –манодыя<br>Дыяпазон – ад сі малой актавы да соль першай актавы<br>Рэгістры фанацыі – памежжа ніжняга і сярэдняга рэгістра<br>Рэзанатары – грудная клетка – рота-глотка<br>Рэзанатарныя вузлы – грудная клетка – падбародак – цвёрдае паднябенне<br>Тып інтанавання – вакальны характар голасавядзення – плаўны<br>Пеўчая пазіцыя – сярэднеязычная<br>Артыкуляцыйная ўстаноўка – А |
| Русалачка, купалачка,<br>Дзе твая Наталачка?<br>На моры купалася,<br>На беражэчку сушылася<br>Та ўсё ў мамкі прасілася:<br>Пусці, мамка, пагуляці,<br>Бо мне молайца не відаці.<br>Мамка дочку не пусціла<br>І ў каморачку да замкнула.<br>А ў каморцы акенечко.<br>А ў каморцы відненечка,<br>Дзе мой мілы пахаджае,<br>З нялюбаю размаўляе. | Русалачка, купалачка,<br>Дзе твая Наталачка?<br>На моры купалас**а**,<br>На беражэчку сушылас**а**<br>Та ўсё ў мамкі прасілас**а**:<br>Пусці, мамка, пагуляці,<br>Бо мне молайца не відаці.<br>Мамка дочку не пусціла<br>І ў каморачку да замкнула.<br>А ў каморцы акенечко.<br>А ў каморцы відненечк**о**,<br>Дзе мой мілы пахаджае,<br>З нялюбаю размаўляе. |

# ЭТНАФАНІЧНАЯ ТРАНСКРЫПЦЫЯ РУСАЛЬНАЙ ПЕСНІ “ПРЫВЯДУ РУСАЛАЧКУ Я ДА БОРУ”




| **Фальклорны тэкст** | **Этнафанічная транскрыпцыя** |
|---|---|
| | Музычны склад –аднагалоссе<br>Стыль інтанавання –манодыя<br>Дыяпазон – ад сі малой актавы да ля першай актавы<br>Рэгістры фанацыі – памежжа ніжняга і сярэдняга рэгістра<br>Рэзанатары – грудная клетка – рота – глотка<br>Рэзанатарныя вузлы – грудная клетка – падбародак – цвёрдае паднябенне<br>Тып інтанавання – вакальны – характар голасавядзення – фрагментарна-штуршковы<br>Пеўчая пазіцыя – сярэднеязычная<br>Артыкуляцыйная ўстаноўка – О |
| Правяду русалачку я да бору Гу!<br>А сама вярнуся да дому<br>Штоб наша русалачка па жыту не хадзіла<br>Штоб наша жыцейка не ламіла<br>Бо наша жыцейка танейкая<br>А ў каласочку таўсценькая. | Пр**ы**вяду русалачку я да бору Гу!<br>А сама вярнуся да дому<br>Штоб наша русалачка па жэту не хадзіла<br>Штоб наша жыцейка не лам**е**ла<br>Бо наша жыцейка танейкая<br>А ў каласочку таўсценька**ё**. |

Метадычныя рэкамендацыі

**ЛІЧБАВЫ АДУКАЦЫЙНЫ РЭСУРС**
**ВІРТУАЛЬНАЯ ЭКСКУРСІЯ (ВІДЭААГЛЯД)**
**“ЯК ГУЧЫЦЬ ЛЮБАНШЧЫНА”**

Гарадскі конкурс лічбавых адукацыйных рэсурсаў
«Адукацыйная лічба 2022»
Намінацыя «Віртуальная экскурсія (відэаагляд)»

Аўтар-складальнік:
Мардань Дар’я Анатольеўна,
педагог дадатковай адукацыі
першай кваліфікацыйнай катэгорыі,
магістр мастацтвазнаўства,
аспірант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў
маб. тэл. +375(29) 575-79-03
e-mail: dashamordan@mail.ru

Метадычнае суправаджэнне:
Гарэлік Наталля Яўгенаўна,
загадчык аддзела мастацкага выхавання
маб. тэл. +375(29) 320-24-17
e-mail: lencvr@minskedu.gov.by

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі
“Маяк” г.Мінска”

220006, Мінск, зав. Палявы, 2а
Тэл. (17) 310-35-24
e-mail: lencvr@minskedu.gov.by